www.etnolog.org.ua

# РЭГІЯНАЛЬНА-ЛАКАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАЙ ПАЭЗІІ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ (на матэрыяле фальклору Ельскага і Кармянскага раёнаў)

**Валянціна Новак**

**УДК 398.33(476.2)**

У статті розглянуто регіонально-локальні особливості окремих явищ календарної обрядовості Гомельської області. Як ілюстративний матеріал обрано фольклорно-етнографічні записи, здійснені в населених пунктах Єльського та Кормянского районів. Детально проаналізовано структурні компоненти колядно-новорічного обрядового комплексу, обряду закликання весни, юр'ївської обрядності та виявлено місцеву специфіку ритуалів, прикмет і повір'їв, пов'язаних з ними.
**Ключові слова:** обряд, обрядовий комплекс, ритуал, прикмети і повір'я, календарна обрядовість, пісня, міфологічні уявлення.

The regional and local peculiarities of separate phenomena of Gomel region calendar rites are considered in the article. Folklore and ethnographic records, realized in Yelsk and Karma districts, are chosen as an illustrative material. The structural components of the Christmas and New Year's ritual complex, the ceremony of Spring calling, Yuriy day ceremonies are analyzed in detail. The local specificity of the rituals, signs and traditional beliefs, connected with them, is revealed.
**Keywords:** rite, ritual complex, ceremony, signs and traditional beliefs, calendar ritualism, song, mythological views.

У сістэме каляндарна-абрадавай паэзіі Гомельшчыны важнае месца адводзіцца каляндарнай абраднасці Ельскага и Кармянскага раёнаў. Засяродзім увагу на асобных з'явах мясцовых народных календароў. Адзначым, што калядна-навагодні абрадавы комплекс і Ельскага, і Кармянскага раёнаў, захоўваючы агульнатрадыцыйную аснову, уключае наступныя структурныя кампаненты: падрыхтоўка абрадавай трапезы (тры куцці), абходныя шэсці калядоўшчыкаў з казой і «звяздой», варожбы на будучы ўраджай і шлюб, прыкметы і павер'і, звязаныя з Ражаством, Новым годам, Вадохрышчам, выкананне ўласна калядных велічальна-віншавальных песень, адрасаваных гаспадару, гаспадыні, дачцэ, сыну і інш.

Як паведамілі жыхары в. Валаўская Рудня Ельскага р-на Бурмель Т. П., 1936 г. н. і Таргонская Р. А., 1931 г. н., «на Каляды варылі тры куцці: першую куццю варылі 6 января перад Рожэствам, другую, багатую куццю, — 13 января перад Новым годам, трэцюю, бедную куццю, — 19 января перад Хрэшчэннем». На першую куццю рыхтавалі такія стравы, як «боршч, кісель, блінчыкі-налеснікі, куццю з пярловай крупы» (запісана ў в. Мядзведнае ад Турчан Марыі Еўтухоўны, 1913 г. н.). З першай куццёй была звязана гаспадарчая варажба. Паколькі калядныя святы ўвасаблялі магічную ідэю «першага дня», то, лічылася, што, якім будзе пачатак, такім будзе і ўвесь год. Па даўжыні саломінак, якія выцягвалі з-пад настольніка, меркавалі, ці «вялікім вырасце лён» (запісана ў в. Мядзведнае ад Турчан Марыі Еўтухоўны, 1913 г. н.). Саломай, узятай з-пад абруса, «падвязвалі» пладовыя дрэвы, «шоб родзілі» (запісана ў в. Мядзведнае ад Турчан Марыі Еўтухоўны, 1913 г. н.). Верхні слой куцці аддавалі курам, «папярэдне абвеўшы вяровачкай круг і расклаўшы там кашу» (запісана ў в. Баранцы ад Бурмель Варвары Іванаўны, 1932 г. н.). Меркавалі, што ў такім выпадку куры ўлетку будуць прыходзіць дадому.

Адзначым, што ў ельскім зімовым цыкле абрад калядавання займаў цэнтральнае месца. Удзельнічалі ў ім і дарослыя, і дзеці. Спачатку прасілі дазволу пакалядаваць. Калі гаспадары дазвалялі, то заходзілі ў хату з прывітальнымі словамі: «Мы не самі прыйшлі, нас Гасподзь Бог прыслаў. / З Ісусам Хрыстом, з святым Раждзеством! / Прачыстая маці вялела гуляці / У каждага двара ў добрага гаспадара»

www.etnolog.org.ua



(запісана ў в. Валаўск ад Жураўлёвай Марыі Маркаўны, 1932 г. н., Ляўкоўскай Галіны Сяргееўны, 1952 г. н.). Асаблівасцю абраду калядавання ў Ельскім раёне, як адзначылі самі інфарматары, з'яўляецца арганічнае спалучэнне язычніцкіх элементаў з хрысціянскімі: «На другую куццю хадзілі калядаваць з казою, са звяздою» (запісана ў в. Валаўская Рудня ад Бурмель Т. П., 1936 г. н. і. Таргонскай Р. А., 1931 г. н.). Як адзначыла Хамец Ніна Аляксееўна, 1929 г. н., з в. Кавалі, «звязду рабілі з хвоі ды ўпрыгожвалі кветкамі», калядаванне суправаджалася наступнымі песеннымі радкамі:

Сею пшаніцу,
А ты дай кусок сала і паляніцу;
Дайце, дзядзька, пірога,
Вывідзем вала за рога.

Абавязковым у рэпертуары калядоўшчыкаў з розных вёсак Ельскага раёна быў тэкст, блізкі да царкоўных калядных песнапенняў, у паэтычным змесце якіх адлюстраваліся біблейскія сюжэты:

Божае нараджэнне, божая сіла,
Што нарадзіла Дзева Марыя божага сына.
Нарадзіўся Сус Хрыстос у Дзевы Марыі.

У кожнай хаце з нецярплівасцю чакалі калядоўшчыкаў, з іх прыходам звязвалі надзеі на добры ўраджай, дабрабыт, шчасце ў сямейным жыцці. Лічылася, «калі калядоўшчыкі не зойдуць у хату якую, тая хата будзе няшчаснай» (запісана ў в. Валаўская Рудня). Іншы раз, калі калядоўшчыкі не атрымлівалі дазволу пакалядаваць, то ім адрасавалі праклёны: «Святое Рожэство, / Шоб тобе до дня / Хату разнесло» (запісана ў в. Кавалі ад Хамец Ніны Аляксееўны, 1929 г. н.).

Падчас калядавання на другую куццю, паводле ўспамінаў Бруевіч Марыі Дзмітрыеўны, 1920 г. н., з в. Ворнаўка Кармянскага р-на, вадзілі казу, з якой звязвалі надзеі на добры ўраджай:

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэрая,
Го-го-го, белая!
Не хадзі, каза,
Ды й па тых сялах:
Па Журавічах, па Махавічах.
Там стральцы-барцы Нікалаеўцы
Хочуць цябе ўбіць,
Кожу аблупіць, боты пашыць.
Боты-халявы збоку дзіравы.
Ну-тка, козачка, павярніся-тка,
Самому пану павярніся-тка,
За кусок сала, за калбасіцу
[1, с. 62].

Заўважым, што ў прыведзеным мясцовым варыянце гучыць матыў відавочнай пагібелі казы ад «стральцоў-барцоў Нікалаеўцаў». Ахвярапрынашэнне жывёлы спалучана з ідэяй паміранне прыроды зімой і яе ўваскрэсеннем вясной — вызначальнай ідэяй каляндарна-абрадавага фальклору. Абрад ваджэння казы адбываўся ў вёсках Высокае і Зяцькавічы вечарам у першы дзень Каляд, а ў вёсках Лебядзёўка і Ворнаўка быў прымеркаваны да другой куцці [1]. Як засведчылі жыхары в. Ворнаўка, у іх мясцовасці «на Каляды насілі свячу»: «<...> сабіраліся вуліцай, увечары ўкрашалі свячу, бралі плацейкі, надзявалі на яе фартушкі, паціркі і ў етай хаце ж вячэралі. А на другі дзень бралі ікону і свячу і неслі ў другую хату. А тыя хазяйкі, ад якой забіралі свячу і якой неслі, должны ў еты час сыпаць саломку нам і ёй дзелаць сцежачку. Устрачаліся на серадзіне і ўмесці з намі ідуць» (запісана ад Бруевіч Марыі Дзмітрыеўны, 1920 г. н.).

У в. Гарадок Кармянскага р-на, калі калядавалі, то і казу вадзілі, і «звязду насілі»: «На Каляды збіраўся гурт хлопцаў і дзяўчат, адну дзяўчыну пераапраналі ў казу: выварачвалі кажух і надзявалі, рабілі з дрэва рогі. Адзін з хлопцаў насіў звязду» (запісана ад Кавалёвай Марыі Рыгораўны, 1935 г. н.).

Адметнасцю мясцовай каляднай традыцыі ў Кармянскім раёне з'яўлялася гульнёвае тэатралізаванае прадстаўленне, якое разыгрывалі «пава з павуком»: «Для гэтага дзяўчыну нараджалі ў длінная плацце, на галаве — вянок з лентамі з бумагі. Гэта была пава». Хлопец быў «павуком» (в. Струкачоў) [1, с. 62]. Паводле

www.etnolog.org.ua



ацэнкі мясцовых жыхароў, калядоўшчыкаў з казой чакалі з нецярплівасцю, а «паву з павуком» не любілі пускаць у хату, бо «яны заўсёды што-небудзь украдалі». Песня, якая выконвалася ўдзельнікамі гэтай гульнёвай часткі абраду, вызначаецца шлюбнай сімволікай (вянок як сімвал дзявочай годнасці, згубленне вянка як сімвал страты цнатлівасці да шлюбу):

Пава, пава па двару лятала,
Перайка ўпала, у рукавок клала,
З рукаўка брала, вяночак віла.
Вяночак звіла, пайшла ў таночак,
З таночка ішла, вяночак згубіла
[1, с. 61].

Вышэйрыведзены факт прысутнасці абрадавага дзеяння шлюбнага характару ў каляднa-навагоднім комплексе сведчыць аб тым, што ідэя шлюбу, працягу роду была не менш важнай у земляробчым календары, чым культы прыроды і продкаў.

Паводле ўспамінаў Мельнік М. М, 1933 г. н., з в. Мядзведнае Ельскага р-на, «на багатую куццю, калі садзіліся за стол, то гаспадар браў ложку з куццёй і казаў: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці, а ўлетку не бывай, бо жалезным прутам ногі поперабіваю». У звычаі клікаць мароз на ўсе тры куцці адлюстраваліся рэшткі старажытных уяўленняў беларусаў, звязаных з верай у духаў продкаў, іх здольнасць уздзейнічаць на свет жывых.

Захоўваецца яшчэ і сёння ў памяці жыхароў і Кармяншчыны традыцыйны агульнабеларускі звычай заклікання марозу на куццю: «Ставілі куццю на стол, і бацька гукаў: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці. А еслі не пойдзеш, жалезнай пугай паб'ем» (запісана ў в. Задуб'е ад Савянковай Анастасіі Рыгораўны, 1909 г. н.).

Багаццем і разнастайнасцю адрозніваецца навагодняя варажба, запісаная ў вёсках Ельскага р-на найбольш поўна, у шматлікіх варыянтах. Напрыклад, прыносілі бярэмя дроў і лічылі, ці да пары іх набралі. «Да і шчытаем: ето пара, ето пара, а ето не пара — значыць, не выйду ў гэтым годзе замуж» (запісана ў в. Мядзведнае ад Мельнік М. М., 1933 г. н.). Паводле ўспамінаў Лобан В. М, 1940 г. н. з в. Кочышчы, «тры дзевачкі пойдуць калядаваць, кожна сабе загадзя намеціць хату. У першай хаце далі піражка, у другой — далі, у трэцяй — далі. Усё гэта палажылі на бляху, каторай печ закрываецца, на парозе паманілі сабаку. Ён прыйшоў, схваціў першы піражок, з'еў — выйшла замуж, схваціў і кінуў — пажыла трохі і развялася, а потым і не прыйшоў — жыве адна». Дзяўчаты імкнуліся вызначыць, у якім баку жыве іх суджаны: «Чоботы перошыбвалі цераз хату. У які бок носам глядзіць, туды і замуж пойдзеш» (запісана ў в. Сугакі). У в. Мядзведнае варажылі наступным чынам: «Пыталіся ў каго-небудзь з сустрэчных, дзе нясуцца іх куры. Калі адказвалі, што дзе ходзяць, там і нясуцца, то выйдзеш замуж. А калі скажуць, што ў сваім доме нясуцца, то не выйдзеш замуж» (запісана ад Мельнік М. М., 1933 г. н.). У в. Валаўская Рудня надзвычай распаўсюджанымі былі варожбы, звязаныя з «паланнем хустак», калі ўсе дзяўчаты клалі хусткі ў вялікую міску і «палалі». «Чыя хустка выпадзе з міскі першая, тая першай выйдзе замуж». Паводле ўспамінаў Хамец Таццяны Астапаўны, 1920 г. н., з в. Бякі, «лягаеш спаць, не разуваючы правую ногу, і гаворыш: «Я лягаю, праву ногу не разуваю. Хто будзе за мною веку дажываць, той прыйдзе маю ногу разуваці». З дапамогай прыведзеных абрадавых сімвалічных дзеянняў моладзь імкнулася зазірнуць у будучае, вызначыць свой лёс, бо асабістая шчаслівая ўладкаванасць у сямейным жыцці, паводле народных павер'яў, уплывала і на плён гаспадарчых работ, урадлівасць зямлі.

Варожбы пра шлюб, запісаныя на Кармяншчыне, у большай ступені захоўваюць традыцыйны агульнабеларускі характар адвольных магічных дзеянняў і заклінанняў. Мясцовы адметны каларыт мае і дзявочая навагодняя варажба, сімволіка якой звязана з зернем, свойскімі жывёламі і птушкамі, прадметамі побыту. Уражвае і захапляе той паэтычны струмень народнай фантазіі, якім

www.etnolog.org.ua



прасякнута імкненне прадбачыць свой лёс, убачыць суджанага ці суджаную, уявіць сваю будучыню, усцешыць свае рамантычныя летуценні. У гэтым можна пераканацца, калі звярнуцца да некаторых мясцовых варыянтаў варажбы, напрыклад: «Бралі мужскія штаны ў зубы і цягалі вакол сваёй хаты тры разы, пры гэтым задумаўшы хлопца» (запісана ў в. Багданавічы ад Белавусавай Анастасіі Савельеўны, 1921 г. н.); «па кучкам насыпаюць зерне і выпускаюць курэй. Чыю кучку ўперад ухопіць курыца, тая ўперад пойдзе замуж» (в. Высокае).

Асаблівасцю калядавання на Кармяншчыне з'яўляецца пераапрананне яго ўдзельнікаў у «цыган». Хутчэй за ўсё гэта было звязана з унясеннем новых элементаў у традыцыйны абрад калядавання, што істотна паўплывала і на песенны рэпертуар, уключэнне песень цыганскай тэматыкі. Па ўспамінах Аляксеенка Н. з вёскі Хізаў, «сабяром трапак, здзелаем ляльку, з ляလькай хадзілі па дамам, дзіцёнка носім, калі ў цыганку пераапранаемся. Адна ідзе з лялькай, абкрытая, а етыя бегаюць, пяюць, скачуць, карты з сабой носяць: «Давай пагадаю! Маладая, красівая, замуж пойдзеш!» [1, с. 68].

Каляды з'ўляліся падрыхтоўчым этапам для атрымання добрага ўраджаю, не выпадкова абрады, якія выконваліся, насілі заклінальны аграрна-магічны характар. Напрыклад, абрад засявання ў вёсках Кармянскага раёна адбываўся на другі дзень пасля шчадравання: «Калі шчадроўшчыкі засеюць збожжам у хаце, то ў гэтым годзе ў хазяіна будзе багаты ўраджай» (запісана ў в. Багданавічы ад Белавусавай Анастасіі Савельеўны, 1921 г. н.).

У шчадроўна-калядных песнях, адрасаваных гаспадару, гаспадыні, дачцэ, сыну, гучаць матывы зычання дабра, здароўя, шлюбнага шчасця. Асабліва відавочнымі з'яўляюцца элементы вясельнай стылістыкі ў калядках, адрасаваных моладзі.

Адметнасцю мясцовай каляднай традыцыі з'яўлялася «спайка», калі дзяўчаты і хлопцы збіраліся ў якой-небудзь хаце, наймалі музыку, рыхтавалі «кашу», а «старэйшыя дзеўкі «білі» кашу» [1, с. 74] (в. Высокае), ці хто-небудзь з хлопцаў, «той, хто больш грошай пакладзе на кашу» (запісана ў в. Задуб'е ад Савянковай Анастасіі Рыгораўны, 1909 г. н.). Прыведзены прыклад сведчыць аб узаемасувязі каляднай і радзінна-хрэсьбіннай абраднасці. Радзінны абрад разбівання гаршка з бабінай кашай, можна меркаваць, быў запазычаны каляднай традыцыяй, напэўна, таму, што ў Каляды адзначалі нараджэнне Хрыста. Калі ж звярнуцца да апісання каляднай гульні шлюбнага характару, запісанай у в. Высокае, то можна пераканацца ў лагічнай прысутнасці абраду «бабінай кашы» на калядным ігрышчы: «Вечарам зімой збіраемся ў адной хаце і гуляем у розныя гульні. У хванты, у жмуркі ці ўздумаем жаніць каго-небудзь, выбіраем «жаніха» і «нявесту», садзім іх у вазок, самі ўпрагаемся і хутка вязем іх вянчацца. І вось у хаце мы гуляем «вяселле», пажэнім, а тады «радзілі» яны ўжо. Яна платочак на жывот пакладзе — ужо пузаценькая ходзя. Кукалку скруцім, мордачку нарысуем. «Радзіла» — надо ў адведкі ісці, хлеба і сала несці» [1, с. 74]. Звычай «гуляць кашу» на Каляды з'яўляецца таксама мясцовай асаблівасцю каляднай традыцыі ў в. Ліпаўка Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. Сутнасць гэтай з'явы заключалася ў тым, што «пад канец ігрышча ставяць на стол гаршчок з кашай, наверх палаценца, якое рыхтавала адна з дзевак. Тады ўжо разыгрываюць кашу: хто болей паложыць грошай, што багацейшы, тэй ужэ забірае палаценца сабе, б'ець кашу, патом яе дзелюць, ядуць, а грошы расходуюць на другі дзень ігрышча» [2, с. 6].

У прыкметах і павер'ях Кармяншчыны, звязаных з Калядамі, надзвычай ярка адлюстраваўся светапогляд нашых продкаў, іх паэтычнае асэнсаванне складаных з'яў жыцця, пошукі мудрых тлумачэнняў незразумелых ім прыродных фактаў, імкненне спасцігнуць таямніцы рацыянальнага гаспадарання на зямлі, знайсці найлепшыя сродкі, каб дасягнуць у будучым добрага ўраджаю на палетках і прыплоду свойскай жывёлы. І хоць калядны

www.etnolog.org.ua



цыкл не быў непасрэдна звязаны з правядзеннем земляробчых работ, але ўжо ўзімку ўсе думы і жаданні селяніна былі звязаны з чаканнем новага ўраджаю. Менавіта таму такімі важнымі, напоўненымі магічнай сілай здзяйснення з'яўляюцца ўсе тыя сімвалічныя абрадавыя дзеянні, да якіх звярталіся нашы продкі на працягу ўсяго каляднага перыяду. Найбольш распаўсюджанымі павер'ямі, якія і сёння, як і было заведзена раней, вызначаюць гаспадарчы і сямейны жыццёвы парадак, з'яўляюцца наступныя: «верх куцці зразалі і давалі скату патрохі», «на Каляды семкі елі, на пол плявалі, штоб ураджай быў харошы» (запісана ў в. Хізаў ад Сапроненка Ніны Сільвестраўны, 1913 г. н.); «зерне кідалі ў печ, каб была добрай жніўка»; «яшчэ ў першы дзень Каляд, калі ў хаце ёсць дзеці, бацькі кідалі зерне на паліцу, прыгаворваючы: «Радзі, Божа». А дзеці павінны былі грабсці да сябе гэтае зерне болей» (запісана ў в. Зяцькавічы ад Марозавай Ганны Іванаўны, 1924 г. н.).

Факт ваджэння карагодаў на Каляды засведчылі жыхары в. Высокае: «Хараводы вадзілі большую часць на Каляды каторыя болей выдумлівыя хлопцы і дзеўкі. Табун жа бальшой па вуліцы ходзіць» (запісана ў в. Высокае ад Жлобы Юліі Клімаўны, 1909 г. н.). Калі ў іншых вёсках Кармяншчыны рыхтавалі тры куцці (на Ражаство, Новы год і Хрышчэнне), то ў в. Высокае «варылі куццю на первый дзень Каляд. Згатовяць, паставяць яе ў карзінку ў сена і да трэціх Каляд яе не ядуць. А тады ўжо на трэція Каляды ядуць гэту куццю і скаціне даюць» (запісана ў в. Высокае ад Жлобы Юліі Клімаўны, 1909 г. н.).

Са святкаваннем трэцяй куцці (Вадохрышча) быў звязаны матыў «развітання» з Калядамі, калі «на хаце на Хрышчэнне ставілі хрэсцікі — «Каляду запісвалі» (запісана ў в. Высокае ад Кавалёвай Ганны Ягораўны, 1929 г. н.).

Як бачым, структуру мясцовага калядна-навагодняга комплексу Кармяншчыны складалі такія абрадавыя элементы, як тры куцці (у в. Высокае рыхтавалі толькі першую куццю), абрад ваджэння казы на другую куццю (вв. Лебядзёўка, Ворнаўка), а таксама — пад вечар у першы дзень Каляд (вв. Высокае, Зяцькавічы), заклікание марозу на першую куццю (вв. Задуб'е, Багданавічы), хаджэнне са «звяздой», абрад засявання на Новы год (вв. Хізаў, Лебядзёўка), абрад пераносу «свячы» (в. Ворнаўка), калядныя ігрышчы, на якія збіраліся з усіх суседніх вёсак (в. Задуб'е), варожбы, міфалагічныя прыкметы і павер'і, звязаныя з куццёй, выкананне шчадроўных песень, вылучэнне некалькіх гуртоў калядоўшчыкаў (дарослых, хлопцаў-калядоўшчыкаў, дзяцей), калядныя гульні шлюбнай скіраванасці, пераапрананне ў цыган. Прыведзеныя кампаненты яднаюць лакальнае зімовае святкаванне з агульнанароднай каляднай традыцыяй. Па-мясцоваму адметныя з'явы калядна-навагодняга перыяду на Кармяншчыне — гэта хаджэнне калядоўшчыкаў з «павай і павуком» (вв. Струкачоў, Задуб'е), абрад «бабінай кашы» («спайка») (вв. Высокае, Задуб'е), ваджэнне карагодаў (в. Высокае).

Калядна-навагодні комплекс Ельшчыны адрозніваўся найперш арганічнай паяднанасцю язычніцкага абраду ваджэння казы і хрысціянізаванага хаджэння са «звяздой», выкананнем рытуалу заклікання марозу на ўсе тры куцці і выкананнем царкоўных калядных «песнапенняў».

У некаторых вёсках Ельскага раёна на пытанне, як гукалі вясну, інфарматары адказвалі адназначна: «Вясну не гукалі ў нас, але ж вяснянкі спявалі». Адметнасцю мясцовай фальклорнай традыцыі Ельшчыны з'яўляецца той факт, што тут звязвалі Масленіцу з абрадам сустрэчы вясны. У склад масленічнага абрадавага комплексу ўваходзілі найперш элементы, уласцівыя для абраду гукання вясны: распальванне вогнішча, выхад дзяўчат і хлопцаў на бераг ракі, заклікание вясны, ваджэнне карагодаў, выкананне веснавых карагодных песень:

Ой вясна, вяснячка,
Ой ты, мая ўнучанька,
Ой гаю!
Ты свяці па-летняму, па-вясенняму.
Ой гаю!

www.etnolog.org.ua



Сонейка закоціцца,
Вясна не праходзіцца.
Ой гаю! (запісана ў в. Шарын ад Шынкарчук М. П., 1907 г. н).

У в. Валаўск гукалі вясну на Саракі 9 (22) сакавіка. З гэтым святам звязвалі такія сімвалічныя абрадавыя дзеянні: «трэба было зламаць 40 дошчак, пакачаць 40 калёс, з'есці 40 пампушак, спекчы 40 жураўлікаў» (запісана ад Жураўлёвай Марыі Маркаўны, 1932 г. н., Ляўкоўскай Галіны Сяргееўны, 1952 г. н.). Даследчыца Т. А. Агапкіна звязвае гэта абрадавае печыва з міфалагемай вяртання продкаў: «Агульнакультурная прагматыка гэтага сімвала заключаецца ў тым, каб забяспечыць гэта вяртанне, аблегчыць кантакты жывых і мёртвых, а таксама задаволіць патрэбы апошніх у харчаванні» [3, с. 272]. Песні-вяснянкі, запісаныя ў вёсках Ельскага раёна, адрозніваюцца разнастайнасцю традыцыйных сюжэтаў, сярод якіх асабліва вылучаюцца такія, як «Вясна, красна, што ты нам прынясла?», «Вясна, вясна, вясняначка, дзе ж твая дачка Ульяначка?». У мясцовых варыянтах першага песеннага сюжэта гучаць матывы заклікання вясны, уласцівыя агульнабеларускім вяснянкам. У тэкстах вар'іруюцца тыя дары, што прыносіць шчодрая вясна: у вёсцы Кавалі гэта «карабачка бобу / Хлопцам на хваробу, / Каробачка яіц / Дзеўкам на гасцінец»; у в. Новая Рудня гэта «цёпла лета, ціхае / І цёплая вадзіца, / Зямліцы — травіца», а таксама і людскія ўцехі («старым бабкам па кійку, / А пастушкам — па яйку») [4, с. 38–39].

Мясцовы варыянт вяснянкі, запісаны ў в. Кавалі, дае падставы яшчэ раз пераканацца, наколькі моцна ўплывала адраджэнне прыроды вясной на стан душэўных перажыванняў чалавека, адсюль і пэўная ступень лірызаванасці і нават гумарыстычнай скіраванасці сюжэтаў вяснянак:

А на нашай вуліцы
Да ўсі хлопцы — малодцы,
Да ўсі хлопцы — малодцы,
Убілі жабку на калодцы,
Да ўсім хлопцам па лапцы,
А Іваньку цэла жабка,
Як пашые, будзе шапка [4, с. 39].

У в. Княжабор'е з абрадам гукання вясны былі звязаны такія магічныя дзеянні, як гульня ў «скокалкі» («ето лажылі доску на палено, і адна на адном канцы, друга — на етом. Я прыгнула — тая падлетае, тая ляціць і прыгае — я падлятаю»), выразанне хлопцамі 40 «катлоў з дзерава», якія трэба было пакаціць і разбіць, выпечка дзяўчатамі 40 «булак», якія трэба было з'есці.

Паўсюдна на тэрыторыі Кармянскага раёна быў вядомы абрад гукання вясны. Інфарматары Кармяншчыны пацвердзілі, што вясну ў іх мясцовасці гукалі і на 1 сакавіка, і на 9 сакавіка, і на «Благавешчанне» (Дабравешчанне) (25 сакавіка), пры гэтым выконвалі розныя песні: «На берагу вуця купалася» (в. Ліцвінавічы), «Благаславіця, старыя дзяды» (в. Валынцы), «Пусці, маменька, на ручэй гуляць», «Пакацілася пяро пад Мацвеява сяло» (в. Высокае). У вёсцы Лебядзеўка «адкрывалі вясну» на Саракі, на 9 сакавіка па ст. стылі: выпякалі 40 «галушачак, птушачак, лісапетак, пячэнне раздавалі дзецям», спявалі песню на агульнабеларускі сюжэт: «Ой, вясна, ды й вясна, ды й, весянка, / Што ж ты нам прынесёлка, прынесёлка» [1, с. 79].

Своеасаблівасцю абраду гукання вясны на Кармяншчыне з'яўляецца наступны цікавы момант: «Па вадзе пускалі плыць дошчачку, на якой клалі хлеб і запальвалі свечку», адначасова спявалі:

Пусці, маменька, на ручэй гуляць.
Ой, лі, ой, люлі, на ручэй гуляць.
На ручэй гуляць, селязнёў віцаць,
То не селязень, то не селязень,
То ж не сізенькі, то ж мой міленькі
[1, с. 13].

Паводле ўспамінаў Герасіменка Ефрасінні Рыгораўны, 1927 г. н., перасяленкі з в. Дубравіна ў сувязі з чарнобыльскай бядой, абрадавым пячэннем у выглядзе «жаўранкаў» на Са-

www.etnolog.org.ua



ракі частавалі і дарослых, і дзяцей, а таксама «кармілі ім жывёлу, каб здаровай была. Сорак разоў павінны былі катнуцца на арэлях кожны малы і дарослы» з мэтай засцярогі ад камароў, «каб камары ўлетку не кусалі».

У в. Старая Зенькавіна гукалі вясну 1 сакавіка. Паводле ўспамінаў інфарматараў, вогнішча не распальвалі і карагодаў не вадзілі. У асноўным «маладзейшыя дзеўкі» выконвалі веснянкі на сюжэт «Вясна, вясняначка, а дзе ж твая дачка-паненачка?». У гэтай вёсцы на Сараці абрадавым печывам у выглядзе жаўранкаў частавалі адзін аднаго, давалі «выпечанае рэчыва жывёле, каб яна была здаровай» (запісана ад Мінчанка Праскоўі Лаўрэнцьеўны, 1922 г. н.).

Матыў звароту да жаўранкаў знайшоў таксама адлюстраванне ў мясцовым песенным варыянце: «Жаваранaчкі, прыляціця, / Вяснукрасну прынясіця» [1, с. 79].

Можна пагадзіцца з меркаваннем Т. А. Агапкінай, што «звернуты да жаўранкаў заклік прыляцець і прынесці вясну адлюстраваны прама і няма падстаў бачыць у ім больш глыбокія сэнсы» [5, с. 277].

Мясцовым элементам у структуры абраднасці гукання вясны ў в. Валынцы з'яўлялася «кіданне булачкі» на ваду падчас загукання:

Благаславіця, старыя дзяды,
Старыя дзяды, ой, вясну-красну пагукаці,
Пагукаці, цёплае лета ўстрычаці,
Цёплае лета ўстрычаці, зіму люту праклінаці

[1, с. 78].

Як бачым, на тэрыторыі Кармяншчыны суіснуюць і «загуканне вясны», і абрад «жаўранкаў» у складзе адзінага фальклорна-этнаграфічнага комплексу.

Юраўскае свята ў вёсках Ельскага раёна звязваюць з першым днём выгану жывёлы ў поле. Паводле ўспамінаў інфарматараў, у гэты дзень давалі жывёле печыва, затым дубчыкамі пасвечанай вярбы выганялі яе на пашу, а «да ўзыходу сонца адразалі каровам хвосцікі і лажылі іх перад дзвэрцьмі, штоб карова заўсёды ішла да свайго хваста» (запісана ў в. Валаўск ад Жураўлёвай Марыі Маркаўны, 1932 г. н.). Калі выганялі карову з хлева ў поле, то чыталі адпаведную замову: «Ідзі, божая кароўка, пасіся, / А прыйдзе вечар, дамоў вараціся. / Першым разам, лепшым часам / Госпаду Богу памалюся, / Святай Прачыстай пакланюся» (запісана ў в. Валаўск ад Жураўлёвай Марыі Маркаўны, 1932 г. н.); «Ідзі, божая кароўка, у чыстае поле, у зялёныя лугі. Там табе яда, трава зялёная, вада студзёная. Як тая ў моры вадзіца прыбаўляецца, каб так у нашай кароўкі малачко прыбаўлялась. А як у моры бераг з беражком не сходзіцца, каб к маёй кароўцы ўрокі не прыходзілі: ні жаночыя, ні дзявочыя, ні хлапечыя. І ўгрэе яе яснэ сонейка, а дамоў прывядзе ясны месяц. Амінь» (запісана ў в. Валаўск ад Касенка Вольгі Васільеўны, 1939 г. н.).

У в. Мядзведнае перад тым, як выгнаць карову ў поле, клалі сякеру, цераз якую, па павер'ях, калі пераступіць карова, то не будзе зайздрасці ў людзей. У юраўскім комплексе абрадаў і павер'яў адлюстраваліся міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з верай у існаванне ведзьмаў. Як паведаміла Касенка Вольга Васільеўна, 1939 г. н., з в. Валаўск, «на Юрыя сáмо ж ведзьмы, іх людзі бачылі: некаторыя бегалі без сарочкі, а іншыя з цадзілкаю збіралі расу. Людзі абараняліся ад ведзьмаў, перасыпалі дарогу святым макам ці мурашнікам».

Як адзначыла Шынкарчук Марыя Пятроўна з в. Шарын, 1907 г. н., «каля дзвярэй лажылі замок, каб ведзьма нічога не ўкрала». У тэксце юраўскай песні, запісанай у в. Асавы Ельскага р-на, гучаць матывы прадказання дзявочага лёсу, бацькоўскага суму ў сувязі з нешчаслівай доляй дачкі:

Пагнала дзеўка ў дуброву валы,
Пагубіла, сама заблудзіла.
Валы ў дуброве, а татка ў доме.
Ен па двару ходзіць,
Белы ручкі ломіць,
Сам сабе гаворыць:
— Валы я за дзень раздабуду,
А па свайму дзіцятку

www.etnolog.org.ua



Цэлы век плакаць буду.
На вянках дзеўкі гадалі,
Вянкі ў рэчку яны пакідалі.
Чый вянок плыве, а чый патануў.
Адна дзеўка, яна не змаўчала,
Гучным голасам крычала:
— А мой патануў, мілы абмануў
(запісана ад Грыц Марыі Іванаўны, 1942 г. н.).

Вядома, што «абрадава-песенная традыцыя Юр'я на Беларусі ўключае два семантычна выражаныя комплексы — жывёлагадоўчы і земляробчы» [3, с. 211]. Адзначым, што на Гомельшчыне вядомы як комплекс рытуалаў, звязаных з выганам жывёлы на пашу, так і абрады абходу поля. Заўважым, што юраўскія абрады па ўсім арэале бытавання маюць лакальныя адрозненні. Даследчык А. С. Ліс звярнуў увагу і на факт іх значных рэгіянальных адрозненняў, заўважыўшы, што «земляробчы комплекс юраўскай абраднасці беларускай фалькларыстыкай зафіксаваны слабей, запісы зроблены пераважна ў паўднёвым, паўднёва-заходнім і заходнім рэгіёнах» [6, с. 216]. Юраўская абраднасць на Ельшчыне захавала не толькі аграрна-магічныя ўяўленні, звязаныя з жывёлагадоўляй, але і з земляробствам. Напрыклад, у в. Валаўск на Юр'я адбываўся абрад агледзін нівы. Як адзначыла Жураўлёва Марыя Маркаўна, 1932 г. н., «гаспадар бярэ каравай і ідзе абглядаць пасевы, калі каравай вышэй жыта, то будзе добры ўраджай». Юраўскі карагод, які выконваюць на Ельшчыне менавіта ў в. Валаўск, — асаблівасць мясцовай веснавой традыцыі. Даследчыца А. А. Плотнікава, аналізуючы складаны па структуры і сістэме сімвалаў веснавы абрад першага выгану жывёлы, адзначае, што на Палессі часцей за ўсё ў якасці абярэгаў ад зглазу і ад ведзьмаў выкарыстоўвалі сякеру, радзей — касу, серп, нож. Міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з апошнім прадметам, пацвердзілі інфарматары з вёскі Кочышчы: «...ножа ў порог застрыкають, коб ведьмам языки резаў» [7, с. 112].

Што да характарыстыкі юраўскай абраднасці Кармяншчыны, то рытуал выгану жывёлы ў поле суправаджаўся замоўнымі формуламі, напрыклад, як «выганяюць жывёлу ў поле, бяруць хлеба і абносяць яго кругом трубы і гавораць: «Як печ стаіць на месцы, каб і мая жывёла пільнавала сваё месца і хазяіна» [1, с. 89] (в. Асінаўка); «як я без хвартука не магу абысціся, так каб і ты, мая цясютка, з двара нікуды не зыходзіла» [1, с. 90] (в. Задуб'е). Перад тым як выгнаць жывёлу ў поле, у в. Асінаўка выконвалі не толькі простыя абрадавыя дзеянні, але і выконвалі складаны па сваёй сутнасці рытуал: «У сераду пякуць з цеста хрэст, бяруць тры невялікія каменчыкі, нож, замок, бязмен, сякеру, курыныя яйкі, грамнічную пасвяцоную свечку, бяруць з калодзіжа ваду, выцягаюць са страхі салому, патом чэраз увесь скот перакідаюць камень і абліваюць вадой. І так тройчы. Патом чэраз ета ўсё пераганяюць скот» [1, с. 88]. Паводле ўспамінаў Андрыянавай Наталлі Дзямідаўны, 1928 г. н., з в. Асінаўка, «на Юр'я моляцца, абыходзяць сваю усадзьбу з пірагом, на мяжу тыкаюць костачкі, зберажоныя ад Вялікадня, і гавораць: «Юрый, рана адамкай землю, выпускай расу на цёплае лета, на буйнае жыта, на ядраністае, на каласістае, гаспадару на здароўе» [1, с. 88].

Прааналізаваныя матэрыялы па зімовай і асобных з'явах веснавой абраднасці пацвярджаюць багацце мясцовай спецыфікі каляндарна-абрадавага фальклору Кармянскага і Ельскага раёнаў Гомельскай вобласці.

## Крыніцы і літаратура

1. Новак В. С. Не згасне жывое народнае слова (Пра багацце і шматграннасць фальклору Кармяншчыны). *Крыніц кармянскіх перазвоны (абрады і песні ў сучасных запісах).* Гомель : Гомельскі цэнтр навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 2000. С. 6–25.

www.etnolog.org.ua



2. Традыцыйны фальклор Магілёўскага Падняпроўя / уклад. Т. Б. Варфаламеевай ; Бел. ін-т праблем культуры. Мінск, 1996. 126 с.

3. Агапкина Т. А. Очерки весенней обрядности Полесья. *Славянский и балканский фольклор.* Москва : Индрик, 1995. С. 21–107.

4. Новак В. С. Народная творчасць Ельскага раёна. *Беларуская літаратура. Рэсп. міжведамасны зб.* Гомель : Выд-ва Гом. ун-та, 2001. Вып. 21. С. 434–461.

5. Агапкина Т. А. Этнографические связи календарных песен. Встреча весны в обрядах и фольклоре восточных славян. Москва : Индрик, 2000. 336 с.

6. Каляндарна-абрадавая паэзія / А. С. Ліс, А. І. Гурскі, В. М. Шарая, У. М. Сівіцкі ; навук. рэд. А. С. Фядосік. Мінск : Беларуская навука, 2001. 515 с.

7. Плотникова А. А. Первый выгон скота в Полесье. *Славянский и балканский фольклор.* Москва : Индрик, 1995. С. 108–141.

## References

1. Novak V. (2000) Ne zgasne zhivoe narodnae slova (Pra bagatstse i shmatgrannasts falkloru Karmianshchyny). *Krynits karmianskih perazvony (abrady i pesni v suchasnyh zapisah).* Gomel: Gomelski tsentr navukova-tehnichnay i dzelavoy infarmatsyi, pp. 6–25.

2. Varfalameeva T. (compiler) (1996) *Tradytsyyny falklor Magiliovskaga Padniaprovya* (Bel. in-t prablem kultury). Minsk, 126 pp.

3. Agapkina T. (1995) Ocherki vesenney obriadnosti Polesya [Essays on Polissia Vernal Rites]. *Slavianskiy i balkanskiy folklor* [Slavonic and Balkan Folklore]. Moscow: Indrik, pp. 21–107.

4. Novak V. (2001) Narodnaya tvorchasts Elskaga rayona. *Belaruskaya litaratura. Resp. mizhvedamasny zb.* Gomel: Vyd-va: Gom. un-ta, Iss. 21, pp. 434–461.

5. Agapkina T. (2000) *Etnograficheskie sviazi kalendarnyh pesen. Vstrecha vesny v obriadah i folklore vostochnyh slavian* [Ethnographic Relations of Calendar Songs. Meeting of Spring in Rites and Folklore of East Slavs]. Moscow: Indrik, 336 pp.

6. Fiadosik A. (sci. editor) (2001) *Kaliandarna-abradavaya paeziya* (A. Lis, A. Gurski, V. Sharaya, U. Sivitski). Minsk: Belaruskaya navuka, 515 pp.

7. Plotnikova A. (1995) Pervyy vygon skota v Polesye [A Maiden Pasture in Polesye]. *Slavianskiy i balkanskiy folklor* [Slavonic and Balkan Folklore]. Moscow: Indrik, pp. 108–141.

## Summary

The article is dedicated to the investigation of the regional and local peculiarities of the Gomel region calendar and ritual poetry. Attention is paid to the specificity of separate phenomena of the Winter and Spring cycles of the Yelsk and Karma districts agricultural calendar. The structural components of the local Christmas and New Year's ritual complexes are considered in detail.

On the basis of the authentic materials, recorded in the field expeditions, the distinctive features of the preparation of the ceremonial dish (kutia), the local peculiarities of the Christmas caroling rite in the villages of Yelsk and Karma districts are revealed. Interesting examples of both economic fortune-telling and the divination related to the second ritual part named as *kutia* celebration are given. Such peculiar facts of Christmas and New Year's periods as the roundabout procession of carol-singing people with a *spider* (Strukachov, Zadubiye villages), the rite called as *babyna kasha (old woman's porridge)*, well-known as *spaika*, peculiar for Vysokaye and Zadubiye villages have been revealed with the help of folklore and ethnographic materials, recorded in Karma district.

The facts of the frost calling ritual while the second kutia celebration are confirmed with the direct reminiscences of the inhabitants of the aforenamed districts of the Gomel region. Its semantics is connected with the belief in the ancestry spirits, their magical abilities to influence on the surroundings.

www.etnolog.org.ua



Specific features have been distinguished in the Spring calling ceremony on the Gomel region territory. The folklore tradition of Yelsk district is in the organic combination of the elements peculiar both to the Spring calling rite and Shrovetide rituals, while such ceremonies are absent in Karma region. The existence of so called S*pring calling* and the *larks* rites within a single folklore-ethnographic complex have been noted just here. The execution of spring songs (vesnianky) has been accompanied by specific actions with the board. It is placed on the water, bread and a candle have been put on it, with a *bun* thrown into the water during the Spring calling. It should be mentioned among the local elements in the structure of Spring calling ritual.

The Yuriy day complex in the villages of Yelsk and Karma districts is distinguished by the rituals preserving both of cattle-breeding (the rite related to the first cow pasture in the field) and the agricultural orientation (the rite of the cornfield roundabout). The Yuriy day round dance, performing in Volavsk village of Yelsk region, is a spring tradition local peculiarity. In some villages of Karma district the rite of the first cow pasture in the field has been accompanied with the charms and corresponding actions with certain subject attributes. They both have a magic significance.

Folklore and ethnographic materials, presented in the article as the examples, are a vivid confirmation of the research topicality of the problem based on ethnic, regional and local correlation in modern Folkloristics. Preserving the common ethnic basis, Winter and Spring rites in Gomel region are notable for their original local specificity.

**Keywords**: rite, ritual complex, ceremony, signs and traditional beliefs, calendar ritualism, song, mythological views.